рэлігіі. Але калі мастаком выкарыстоўваюцца класічныя знакі, яны напаўняюцца сучасным адчуваннем прасторы і сваім разуменнем. Вонкава мастак адзначае гранічную канцэнтрацыю рытмаў, аб'ёмаў і пластычны малюнак ліній, элементаў формы. Так адна ідэя выяўляецца ў розных варыянтах.

Пранікненне ў народнае разуменне мадэлі структуры свету набывае асаблівае значэнне як першы крок у прастору вобразна-эмацыянальнага мыслення ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Т.І.Васюк,
*дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗБАН, ГАРШЧОК, ГЛЯК ЯК СІМВАЛЫ ВЕЧНАСЦІ

Многія навукоўцы ў наш час адносяць кераміку да рамесніцкага віду мастацтва, асноўную частку якога складае ганчарства. На наш погляд, кераміка мастацкая і тыражная адносіцца да дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Кожны адзінкавы твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва складаецца са зместу і формы. Паміж гэтымі паняццямі існуе непадзельная сувязь. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва з'яўляецца агульным паняццем, а твор — адзінкавым. Цікава адзначыць, што кожны асобны твор або выраб як адзінкавая з'ява нясе ў сабе істотныя рысы таго віду мастацтва, да якога ён належыць. Разгледзім суадносіны формы, зместу і мастацкага вобраза ў традыцыйнай і сучаснай беларускай кераміцы, шлях "магічнага" працэсу пераўтварэння звычайнага камяка гліны ў выраб з мастацкімі якасцямі.

Ганчарныя вырабы адрозніваюцца ад пластмасавых, поліамідных або полістыролавых па форме і матрыцы тым, што пластмаса дакладна паўтарае матрыцу вырабу, і ўвесь тыраж мае аднолькавы выгляд. Асаблівасці ганчарных

вырабаў у тым, што традыцыйнае тачэнне формы на ганчарным коле і далейшыя працэсы сушкі, замыўкі і абпалу надаюць вырабу індывідуальныя якасці. Да нядаўняга часу гэта можна было бачыць на кірмашах нашай краіны. Аднолькавыя гаршочкі ў гаршчэчніка не атрымліваліся. Мастацкія якасці, тонавыя і каляровыя расцяжкі на форме гліняных вырабаў надаваў агонь у спалучэнні з вокісамі металаў. Ад абпалу выраб ужо меў непаўторныя рысачкі, якія пераўтвараліся ў пластычнае "пісьмо" на сіметрычнай цэнтрабежнай форме вырабу. Звернемся да разгляду асобных твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, напрыклад да вырабаў, якія знаходзяцца ў музеях нашай краіны. Мы ўжо адзначылі, што кожны твор нясе ў сабе істотныя рысы керамікі як віду мастацтва. Пэўныя суадносіны зместу, формы і мастацкага вобраза керамікі ўтвараюць паняцце беларускай традыцыйнай керамікі. Гэта паняцце можна раскрыць, вывучаючы:

1) сакрэты рамяства;
2) віды ганчарнага посуду;
3) функцыянальнае прызначэнне вырабаў;
4) пластычныя асаблівасці керамічных мас;
5) мастацкія якасці дэкору: васкаванне, глянцаванне, дымленне, абвар;
6) рэгіянальныя асаблівасці керамікі.

Як можна дасягнуць той дасканаласці вырабаў з гліны, якія мы бачым у музейных экспанатах? Як нараджаецца твор у мастацкай кераміцы? Якім шляхам увасабляюцца якасці традыцыйнай керамікі ў вырабе? Пры вырабе твора ўлічваюцца матэрыял, функцыя, канструкцыя, сілуэт, аб'ём, фактура, колер, форма. Вялікае значэнне маюць пры гэтым пачуцці мастака, яго ўяўленні, успрыманне асаблівасцей прызначэння вырабляемага прадмета, бо ў ім адлюстроўваецца светапогляд майстра. Гліна — ідэальны пластычны матэрыял для акрэслівання формы. Гарманічны выраб дае эстэтычную асалоду сваёй рэалізаванай

канструкцыяй і пластыкай вырабу, у якім спалучаюцца пачуццёвае і рацыянальнае творчага працэсу.

Гаршчок з'яўляецца сімвалам быту. Яго замкнёная прастора самадастатковая, у той час як форма бясконцая, быццам кола. Стварыць гаршчок — гэта значыць напоўніць яго зместам, даць яму жыццё дзеля таго, каб ён сам стаў для чалавека крыніцай энергіі.

Здаўна гаршчком называлі пасудзіну, якая прызначалася для варкі ежы (баршчу, кашы і іншых страў). Гаршчкі ў беларусаў былі розных памераў: ад 15 літраў да 0,5 літра. Існавалі яшчэ і рытуальныя пасудзіны: гаршчок у форме паўзакрытага шара з накрыўкай і "вухам" (так майстры называюць ручку).

Збанам (гарлач, гладыш) завецца пасудзіна для захоўвання малака. На Палессі гладышы мелі пукатае тулава, якое рэзка пераходзіла ў цыліндрычную шыйку. Адметнай рысай збаноў Цэнтральнага рэгіёна было тое, што лінія сілуэта ў іх вельмі пластычная, з вузкімі пераходамі. На поўначы Беларусі выраблялiся збаны-стаўбуны, якія часам апляталіся бяростай ці дротам.

Гляк (глячок, або бунька) — самая дасканалая па форме пасудзіна, якая нагадвае шар з вузкім горлам і ручкамі. Пасудзіна прызначалася для захоўвання алею і вадкасцей. У якасці кантрольнага задання вучні ганчарных майстэрняў павінны былі зрабіць глякі дасканалай пластычнай формы, па іх вызначаўся ўзровень майстэрства ганчара, надавалася званне майстра. Многія мастакі і даследчыкі (Я.Л.Ленсу, М.Ф.Раманюк і іншыя) лічаць, што глякі вельмі падобныя па сілуэту да грэчаскіх анфар.

У наш час людзі імкнуцца набыць керамічныя вырабы для задавальнення сваіх эстэтычных патрэб. Функцыянальны посуд робіцца ва ўмовах масавай вытворчасці, а дэкаратыўная кераміка — у асноўным адзінкавымі аўтарскімі экземплярамі. Іх каштоўнасць вызначаецца мастацкімі якасцямі. Керамічныя вырабы саграюць жытло чалавека, робяць цяплейшымі яго пачуцці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ